**БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ**
**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ НАУКИ**

# 79-я НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ СТУДЕНТОВ И АСПИРАНТОВ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

**Материалы конференции**

**Минск, 10–21 мая 2022 г.**

**В трех частях**

**Часть 3**

Научное электронное издание

МИНСК, БГУ, 2023

**ISBN 978-985-881-456-4 (ч. 3)**
**ISBN 978-985-881-443-4**

© БГУ, 2023

УДК 082(06)
ББК 9я431

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я:
В. Г. Сафонов (*гл. ред.*), О. Н. Янковский (*зам. гл. ред.*),
Г. А. Фофанова (*зам. гл. ред.*), А. А. Кухаренко (*отв. секретарь*),
М. Н. Василевич, А. В. Вериго, О. В. Вологина, Д. С. Воробьёв,
Е. А. Головатая, О. И. Губич, И. М. Кимленко, Т. М. Киселева,
Е. И. Климушко, В. С. Козябо, Н. В. Кошелева, Н. В. Кузьмич,
В. И. Малюгин, В. В. Манкевич, А. В. Наумова, Г. В. Пальчик,
С. И. Шатравский, В. И. Шиманский

Р е ц е н з е н т ы:
кандидат филологических наук, доцент *О. В. Зуева*;
кандидат экономических наук, доцент *Н. В. Мальцевич*

**79-я научная** конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета [Электронный ресурс] : материалы конф., Минск, 10–21 мая 2022 г. В 3 ч. Ч. 3 / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Г. Сафонов (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2023. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – ISBN 978-985-881-456-4.

В третью часть издания включены доклады студентов и аспирантов исторического, экономического и филологического факультетов, Института бизнеса БГУ, Института теологии БГУ.

---

**Минимальные системные требования:**
PC, Pentium 4 или выше; RAM 1 Гб; Windows XP/7/10;
Adobe Acrobat.

Оригинал макет подготовлен в программе Microsoft Word.

В авторской редакции

Ответственный за выпуск *Ю. В. Ситкевич*

Подписано к использованию 15.02.2023. Объем 15 МБ.

Белорусский государственный университет.
Управление редакционно-издательской работы
Пр. Независимости, 4, 220030, Минск.
Телефон: (017) 259-70-70.
e-mail: urir@bsu.by
http://elib.bsu.by

*Поддевалина Я. А.* Качество систем электронного документооборота: трактовка понятия и требования ........................................................... 172
*Посредников О. А.* Организация системы классификации управленческих документов в СССР и БССР в 1960–1980-е гг., как основа построения системы классификации управленческих документов в Республике Беларусь ........................................................ 176
*Ромашов В. С.* Организация медицинского обслуживания в Полоцко–Лепельской партизанской зоне в годы Великой Отечественной войны .................................................. 181
*Русін А. Дз.* Сацыяльная мабільнасць сельскага насельніцтва БССР ва ўмовах калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР (на прыкладзе сацыяльнай групы кулакоў) ............................................ 185
*Саковец Я. С.* Политика по сохранению памяти о Великой Отечественной войне в Республике Беларусь ....................... 189
*Селях А. А.* Дзяўчына ў сацыяльнай структуры заходнепалескай традыцыйнай вёскі ........................................................................ 193
*Семіжон М. П.* Крамянёвы інвентар помнікаў жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі: праблемы і перспектывы вывучэння .................... 197
*Сидорович Я. Д.* Черная чума в Европе в 1347–1353-х гг.: распространение, итоги и последствия .................................................. 200
*Степанов Н. А.* Репрессивная политика ссылок царского правительства в отношении участников восстания 1863–64 годов на территории Беларуси ........................................................................ 205
*Сямёнаў М. А.* Уклад ордэна базыльян у развіццё культуры Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. ................................................. 209
*Трояновская Д. К.* «Антаподосис» Лиутпранда Кремонского как исторический источник ...................................................................... 214
*Чередин Л. В.* Архив рода Сапег в отечественной и зарубежной историографии ........................................................................... 218
*Шалькевич В. Д.* Перформативное искусство как феномен позднесоветского общества ............................................................ 223
*Шатило В. Д.* Официальные страницы органов управления архивным делом Беларуси и зарубежных стран в социальных сетях ........ 227
*Golubev D. A.* General aspects and differences between the policy of the Holocaust in Eastern and Western areas of Belarus during the WWII ......... 231
*Kalasouskaya M. V.* The Shchorsy estate of the Khreptovich family as a place to preserve the historical memory of the belarusian people ......... 234
*Metla S. A.* Transformation of the image of Soviet–British relations in the publications of the British ally weekly (1942–1950) ......................... 239

# ДЗЯЎЧЫНА Ў САЦЫЯЛЬНАЙ СТРУКТУРЫ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ВЁСКІ

**А. А. Селях**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*oxana.gugnuk@gmail.com;*
*навук. кір. – Т. А. Навагродскі, д-р. гіст. навук, праф.*

У артыкуле разглядаецца становішча заходнепалескай дзяўчыны ў сацыяльнай структуры традыцыйнай вёскі. Падкрэсліваецца карэляцыя дзявочага статуса з нормамі сацыяльнай арганізацыі сельскага соцыўма. Разглядаецца роля грамады ў пытаннях выхавання і сацыялізацыі дзяўчат. Аналізуецца ўплыў трансфармацыі сацыякультурнага ландшафта на змены ў сістэме сацыяльнай субардынацыі.

***Ключавыя словы:*** сельскія дзяўчаты; сацыяльная структура вёскі; сацыяльнае становішча; заходнепалеская вёска; традыцыйная культура; трансфармацыя.

Адной са значных праблем сацыяльнай гісторыі беларусаў у розныя перыяды развіцця грамадства з'яўляецца мадэль і формы грамадскіх дачыненняў. Актуальным застаецца вывучэнне пытання пра сацыяльны парадак у грамадстве, стасусы і становішча палоў. Каб мець уяўленне аб асаблівасцях статусу дзяўчыны ў традыцыйным і мадэрным беларускім грамадстве, трэба разглядзець сацыяльную арганізацыю заходнепалескай вёскі ў дынаміцы яе зменаў.

Як вядома, іерархія традыцыйнай вёскі, размеркаванне функцый і абавязкаў у ёй вызначаліся прыкметамі полу і ўзросту. Кожная полаўзроставая група мела свае правы і абавязкі, дакладна вызначаныя эканамічныя і сацыяльныя функцыі, этыкетныя нормы. Сацыяльны парадак рэгуляваўся сельскай грамадой. Грамада, як форма сацыяльнай арганізацыі жыхароў вёскі, ўяўляла сабой малы сацыяльны арганізм, які забяспечваў стабільнасць і парадак у жыццядзейнасці вяскоўцаў [1, с. 200]. Ва ўзаемадзеянне з грамадой дзяўчына ўступала не адразу. Найбольш шчыльныя адносіны з грамадой складваліся на этапе дзявоцтва, які заканчваўся разам з ўступленнем у шлюб. На гэтым этапе адбывалася не проста інтэграцыя дзяўчат ў моладзевую супольнасць, але і ў сельскі соцыум. Дзяўчаты пачынаюць актыўна ўдзельнічаць у культурна-абрадавым жыцці вёскі.

Дачыненні дзяўчыны з соцыўмам, таксама як і сямейныя, былі строга іерархічныя. Старэйшыя, вопытныя чальцы грамады займалі найбольш аўтарытэтныя пазіцыі ў грамадстве. Яны складалі калектыўную ацэнку, уплывовую на статус дзяўчыны. Жыццё дзяўчат, іх якасці, паводзіны – справа ўсіх, не толькі іх. Дзяўчына ў традыцыйным грамадстве – заложніца свайго біялагічнага полу, сваёй натуральнай прыроднай

фізіялогіі. Жаночая фізіялогія – сфера, якая падвяргалася найбольшай стэрэатыпізацыі і маніпуляцыям [2].

Характарызуючы становішча дзяўчыны ў сельскім соцыўме, трэба адзначыць яе несуб’ектнасць. Першачаргова, гэта было звязана з гендэрнай няроўнасцю ў традыцыйным грамадстве. Да замужжа дзяўчына была аб’ектам рознага кшталту маніпуляцый: яе сватаюць, апяваюць, бласлаўляюць, вянчаюць і г д. Да таго ж, усе гэтыя рытуальныя практыкі, як вядома, праводзіліся на вачах сваякоў, грамады, што яшчэ раз падкрэслівае вяршэнства калектыўнага над індывідуальным.

Такім чынам, для традыцыйнага грамадства былі ўласцівы суб’ект-аб’ектные зносіны паміж моладдзю (да якой прыналежалі дзяўчаты) і сельскім соцыўмам. Грамада выступала ў якасці галоўнага кіруючага і кантралюючага «органа» у жыцці сялян. Становішча дзяўчыны ў такіх абставінах можна ахарактарызаваць як строга падпарадкаванае.

Уяўленне аб парадку прадугледжвала строгае захаванне нарматыўнай культуры, звычайнага права, рытуалу і народнага этыкету. Знешні выгляд дзяўчат, паводзіны з хлопцамі, са старэйшымі кантраляваліся звонку. Асуджаліся дашлюбныя палавыя сувязі, публічная праява сімпатый. Учынкі, манеры, якія ігнаравалі нейкую з прынятых нормаў, лічыліся амаральнымі, і, што найбольш значна, дэструктыўнымі [3].

Пільная ўвага менавіта да моладзевай суполкі была абумоўлена наступным: менавіта моладзь з’яўлялася ключавым звяном у грамадстве, праз якое ажыццяўлялася спадкаемства і ўзнаўленне традыцый, што забяспечвала стабільнае развіццё соцыўма. Механізм выжывання сельскай абшчыны засноўваўся на міжпакаленнай перадачы традыцый. Любыя дэстабілізуючыя элементы разбуралі грамаду як супольнасць, уносячы хаос, канфліктнасць, псіхалагічнае напружанне ў жыцці людзей, таму абшчына праз метады ціску і кантролю ў дачыненні да моладзі, клапацілася, каб у вёсцы захоўваўся парадак.

Падрыў існуючага ладу жыцця быў непасбежным. Сацыяльныя, культурныя, эканамічныя пераўтварэнні, якія ажыццяўляліся ва ўз’яднанай БССР, аказвалі безумоўны ўплыў на нормы ўладкавання сельскага грамадства. Разам з арганізацыяй сацыяльнай інфраструктуры, якая прадуглежвала стварэнне новых форм рэалізацыі культурна-побытавых патрэб, адміністрацыйнага апарату, сельская грамада страчвала свае пазіцыі і аўтарытэт у вачах моладзі. У гістарычна непрацяглы перыяд 1950-я–1960-я гг. (уплыў вайны, саветызацыя) пачаў трансфармавацца былы сацыяльны парадак, адбыліся змены ў сацыяльнай структуры вёскі. Стварэнне калгасаў падрывала «замкнёнасць» вёсак, іх наладжаную самаарганізацыю.

Значны ўплыў на зрушэнне традыцыйнасці нанесла ўрбанізацыя. Новы лад жыцця, які канструяваўся на базе «ўрбанізаванай» культуры, аслабляў сацыяльныя сувязі паміж пакаленнямі. Узрасла роля моладзі, якая выступала праваднікам навых «свежых» тэндэнцый. 1960-я–1970-я гг. сталі часам міграцыі сельскай моладзі ў гарады [4, с. 41]. Гарадское насельніцтва – гэта не вясковая грамада, дзе кожны ведаў адзін аднаго і дзе існавалі нефармальныя, аднак уплывовыя маральна-этычныя нормы паводзін і пэўны характар узаемаадносін. У горадзе кожны адказваў сам за сябе, тут не было тых строгіх кантралюючых абмежаванняў грамады, якая сачыла за дзейнасцю кожнага са сваіх членаў.

У 70-х гг. XX ст. дашлюбны перыяд жыцця быў заўважна дэмакратызаваны, на што значны ўплыў аказалі змены ў міжпакаленных сувязях. Адбывалася паслабленне забаронаў у дачыненні да сацыяльнага статусу нявесты, бацькоўскай сям'і, яе месца нараджэння, матэрыяльнага становішча [4, с. 41]. Распачалося актыўнае перайманне дзяўчатамі ўзораў гарадской культуры. Гараджанкі, іх манеры і стыль ўспрымаліся як эталонныя. 1970-я–1980-я гг. сталі часам, калі мяняліся жыццёвыя прыярытэты сялянак: важным становіцца не толькі замужжа і нараджэнне дзяцей, але і атрыманне адукацыі [5, с. 179]. У дзяўчат з'явілася магчымасць для самарэалізацыі па-за роднай вёскі, па-за бацькоўскай гаспадаркі.

Неабходна зазначыць, што нягледзячы на імклівасць тэмпаў канструявання «савецкага», традыцыйнае даволі працяглы час захоўвалася ў свядомасці і побыце вяскоўцаў. Значная частка дзявочай суполкі не мігравала, заставалася «на месцы» і па былой схеме пераймала комплекс ведаў, навыкаў, каштоўнасцяў, якія ўзнаўляла ў сваіх сем'ях. У больш аддаленых ад гарадоў мясцовасцях дзяўчаты працягвалі захоўваць фонд культурных практык сваіх бабуль і матуль. Традыцыя ў тых вёсках, дзе заставаліся і шанаваліся яе носьбіты, пахіснулася, але не знікла цалкам. У выпадках, дзе міжпакаленныя сувязі заставаліся трывалымі, грамада і грамадскае, па-ранейшаму захоўвалалі аўтарытэтнасць, а дзяўчына падпарадкаваны статус.

Такім чынам, становішча дзяўчыны залежала ад сацыяльнай структуры вёскі. Традыцыйнае грамадства ўяўляла сабой недынамічную сістэму, змены ў якой адбываліся вельмі марудна. Аснову сацыяльнай структуры заходнепалескай вёскі складала сельская грамада, стабільнае існаванне якой забяспечвалася арыентацыяй на паўтор некалі заведзенага ўкладу жыцця, звычаяў, традыцый, а таксама прыхільнасцю да існуючых узораў паводзін. Менавіта гэты сацыяльны інстытут выконваў функцыі выхавання маладога пакалення, захавання і перадачы

вопыту. Грамада лічылася значным сацыяльным асяроддзем, якое фарміравала культуру сацыялізацыі індывіда і яго калектыўную свядомасць. Становішча дзяўчыны ў традыцыйнай вёсцы было строга падпарадкаванае. Адсутнасць адукацыйных і прафесійных амбіцый, непазбежнасць перспектывы жыцця ў межах роднай вёскі, перайманне існуючага ладу жыцця рабілі яе падуладнай калектыўнаму.

У саветызаваным з часам вясковым асяроддзі, у якое моладзь паступова ўкараняла элементы мадэрнасці, пачаў ствараццa новы сацыяльны парадак, культурныя практыкі, іншая сістэма субардынацыі. Стварэнне і захаванне сацыякультурнага ландшафту перастала быць прэрагатывай былых эліт (старэйшых жыхароў, бабуль, дзядуль). Кожны член грамады быў адначасова карыстальнікам, спажыўцом і актарам. У такім грамадстве дзяўчына набывала суб’ектнасць. З’яўленне магчымасці навучацца, набываць прафесійныя навыкі, магчымасць атрымання эканамічнай незалежнасці стваралі ўмовы для фарміравання індывіда з асабістымі поглядамі, прымальнымі для яго формамі самапраявы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Шаталава, В.* «Замкнёныя ў вёсцы»: сацыяльная і жыццёвая прастора беларускіх сялян XIX–XX стст. / В. Шаталава // Acta Albaruthenica. Tom 12 / Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego. – Warszawa, 2012. – С. 199–209.
2. *Гугнюк, А. А.* Жаночая фізіялогія ў традыцыйных уяўленнях беларусаў (на прыкладзе заходнепалескай вёскі) / А. А. Гугнюк // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (Гомель, 14 кастрычніка 2021 г.) / рэдкалегія : А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – С. 64–68.
3. *Гримич, М. В.* До питання про статус жінки в традиційному українському суспільстві / М. В. Гримич [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://ethnic.history.univ.kiev.ua/data/2000/7/articles/3.pdf. – Дата доступу: 14.05.2022.
4. *Калачева, И. И.* Семья и брак в БССР в 70–80-х гг. XX в. / И. И. Калачёва // Вышэйшая школа: навукова-метадычны і публіцыстычны часопіс / заснавальнікі: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – 2016. – № 6. – С. 40–45.
5. *Лавриновская, И. В.* Особенности добрачной и семейной жизни сельской женщины в Белорусском Полесье в советский период / И. В. Лавриновская // Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі да 150-годдзя А. К. Сержпутоўскага, 19–20 чэрвеня 2014 г., Мінск / [укладальнікі: А. Г. Алфёрава, С. У. Грунтоў, Ю. С. Пракоф'ева]. – Мінск, 2014. – С. 177–183.